©ГДУ імя Ф. Скарыны

# МАСТАЦКІЯ АДМЕТНАСЦІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЫ В. ІПАТАВАЙ

***М.І. КІРУШКІНА*, Т.А. ФІЦНЕР**

An artistic realization of the poetry of historical genre in the prose of O. Ipatova is examined in the article. The aim of the research is to mark in the artistic peculiarities of historical prose of the writer concerning the specificity of the writer's artistic method and particular attitude to history. The novelty of this work is conditioned by insufficient elaboration of the given problem in the native history and criticism of literature

Ключавыя словы: гістарычны жанр, прататып, намінацыя, сінкрэтычнасць

Для творчасці В. Іпатавай характэрна індывідуальна-мастацкае ўсведамленне асаблівасцей паэтыкі гістарычнага жанру. Яе гістарычныя творы прадстаўляюць зместава-фармальныя сістэмы, якія ўключаюць мастацкую катэгорыю гістарызму, адметную структурную арганізацыю твораў, сінтэз гістарычнай праўды і мастацкага вымыслу.

У гістарычных апавяданнях В. Іпатавай дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы, успамінаюцца падзеі, якія адбываліся на самой справе, уводзяцца ў празаічную канву гістарычныя дэталі. Сюжэт будуецца пры дапамозе вымыслу аўтара. В. Іпатава стварае праўдзівыя гістарычныя сітуацыі для сваіх герояў, характары якіх выяўляюцца пры дапамозе аўтарскай фантазіі. Выкарыстанне аўтарам

рэальных фактаў, пратасюжэтаў і прататыпных вобразаў атрымлівае ў гістарычных апавяданнях незвычайны мастацкі эфект: пашырае тэматычныя і філасофскія рамкі творчасці пісьменніцы, узбагачае гераічны тыпаж у мастацкіх творах, надае тэкстам пераканаўчую дакладнасць, ўзмацняе элементы рамантызму пры апісанні падзей мінулага.

Гістарычныя аповесці аўтара вызначаюцца асэнсаваннем значнасці вобраза нацыянальнага героя ў прасторавых віхурах канкрэтнай гістарычнай эпохі. У творах В. Іпатавай намінацыя такога героя ўвасабляецца праз яго адданае служэнне радзіме, яе нацыянальным і асветніцкім інтарэсам. Важным з’яўляецца мастацкае даследаванне духоўнай і культурнай прыналежнасці героя да роднай зямлі, паказ яго суб’ектыўна-філасофскіх разваг, мудрасці і годнасці, духоўнага ўзвышэння і адраджэння.

Падзеі мінулага ў раманным цыкле «Альгердава дзіда» рэпрэзентуюцца В. Іпатавай паводле даследавання міфалагічнай мадэлі светаадчування беларусаў (раман «Залатая жрыца Ашвінаў»), рэалізацыі анірычных элементаў (раман «Вяшчун Гедзіміна»), ролі і дзейнасці ў мастацкім тэксце персанажа / героя высокага міметычнага модуса (раман «Альгердава дзіда»). У рамане «Залатая жрыца Ашвінаў» пераплятаюцца язычніцкія і хрысціянскія ўяўленні, рэстаўрыруецца гісторыя беларусаў на падставе даследавання і асэнсавання аўтарам рэлігійных і міфалагічных рэалій мінуўшчыны. Пісьменніца ў рамане «Вяшчун Гедзіміна» пасродкам форм анірычнай рэальнасці, прэзентацыі экзістэнцыі і дзейнасці душы / фантазіі героя, вызваленай ад магутнасці розуму, стварае сіметрычныя для беларускай гісторыі асобныя сюжэтныя карціны. У рамане «Альгердава дзіда» жыццё канкрэтнай гістарычнай асобы, яе самасцвярджэнне ва ўнікальнай сацыяльна-гістарычнай прасторы адлюстроўваецца аўтарам праз апісанне рэальных падзей, аналітычнае асэнсаванне заканамернасцей гістарычнай субстанцыі. Раманы В. Іпатавай, у якіх дамінуючым пачаткам выступае даследаванне гісторыі, валодаюць высокім мастацкім узроўнем і асаблівасцямі паэтыкі інтэлектуальнага рамана. Іх вызначае сінкрэтычнасць структуры (суіснаванне ў мастацкім тэксце гісторыі, філасофскіх канцэпцый, міфалагічных матываў і вобразаў) і даследаванне асаблівасцей псіхааналізу. Творы пісьменніцы насычаны гістарычнымі звесткамі і аргументацыямі, дзе дзейнасць герояў падпарадкавана іх учынкам, развагам і псіхалагічнай матывацыі, што з’яўляецца вызначальным для сюжэтнай падзейнасці.

Стылявой дамінантай гістарычнай прозы В. Іпатавай з’яўляецца мастацкі этнаграфізм. Гістарычныя творы пісьменніцы на стылявым і лінгвапаэтычным узроўнях уяўляюць сабой спалучэнне этнаграфічных дэталей, элементаў нацыянальнай і міжнацыянальнай культур.